РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ СЦЭНАГРАФІІ: АД ВЫТОКАЎ ДА ПАЧАТКУ XX СТ.

***Пагоцкая А .В.***
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

*This article is devoted features of development of the Belarus scenography – theatrically-decorative art – and the basic stages of its formation.*

Сцэнаграфія беларускага тэатра бярэ пачатак у народных гульнях і абрадах. Паступовы адбор і крышталізацыя элементаў айчыннага тэатральнага і дэкарацыйнага мастацтва адбываўся ў абрадах, выступленнях скамарохаў і тэатра батлейкі, пры паказе народных драм і спектакляў школьнага тэатра. Элементы сцэнаграфіі прысутнічалі ў рытуальным адзенні і атрыбутах удзельнікаў («Каляды», «Русаллі», «Купалле» і інш.), якія шырока выкарыстоўвалі маскі (мядзведзя, казы,

хорава і інш.). У старажытных рытуальных абрадах, а затым у прадстаўленнях скамарохаў бярэ пачатак беларускі тэатральны касцюм. Абрады з'яўляюцца вытокамі мастацтва грыма ў Беларусі, удзельнікі якіх размалёўвалі сябе сажай, вугалем, крэйдай, сокам раслін. Скамарохі ў калядных гульнях размалёўвалі твары вугалем, крэйдай, бураком, надзявалі маскі з бяросты, скуры, шэрсці.

Наступны этап развіцця сцэнаграфіі на Беларусі звязаны з народным лялечным тэатрам батлейкай. Беларускія батлеечнікі былі сталярамі, разьбярамі і мастакамі. Яны самі будавалі двух'ярусную, больш за два метры скрынку з «небам і раем» на верхнім ярусе, «зямлёй і пеклам» у выглядзе галавы пачвары – на ніжнім. У батлейцы быў выкарыстаны прынцып афармлення сярэдневяковых містэрый. Неад'емнай часткай батлеечных прадстаўленняў з'яўляліся дэкарацыя, грым, касцюмы, тыпажы лялек, дзе кожны персанаж меў свае непаўторныя рысы, свой характар. Батлеечнікі майстравалі лялькі, шылі для іх адзенне, грыміравалі адпаведна характару вобраза, дадаткова выраблялі парыкі, бароды, вусы і падмалёўвалі рысы твару на тканевай ці драўлянай аснове. Лялечны тэатр батлейка аказаў уплыў на далейшае развіццё беларускага народнага тэатра, вобразаў яго персанажаў, тэатра і дэкарацыйнага мастацтва.

З пачатку XVII ст. шырокае распаўсюджанне набывае народная драма як найбольш дасканалая форма тэатральнай дзейнасці. Рэпертуар беларускага народнага тэатра складаўся з драм «Цар Максімільян», «Лодка», «Цар Ірад» і інш. Дэкарацыямі служылі сялянскія хаты, ускраіна лесу, бераг ракі і г. д. Касцюмы шылі і падбіралі самі ўдзельнікі спектакля. У прадстаўленні ўжывалі грым, маскі, прадметы побыту. Героі пастановак лёгка пазнаваліся па асобных частках касцюмаў і рэквізіту. Гэта, у большасці, было звязана з асаблівасцямі ўяўленняў аб тых ці іншых персанажах, якія былі ўжо вядомы з батлейкавых паказаў.

Удасканаленне сцэнічнай пляцоўкі адбывалася з канца XVI ст. у школьным тэатры. Адлюстраванне месца дзеяння патрабавала канкрэтызацыі, што паслужыла асновай для распрацоўкі касцюмаў і дэкарацый (маляваныя заднікі) з улікам характэрных асаблівасцяў гістарычнай эпохі і мастацкага стылю, якія паказваліся ў спектаклі. У школьным тэатры было працягнута развіццё мастацтва грыму: яму надавалася значная роля: з яго дапамогай дасягалася знешняя трансфармацыя персанажаў і ствралася яркае відовішча.

Пачынаючы з сярэдзіны XVIII ст., развіццё сцэнаграфіі было звязана з дзейнасцю прыватнаўласніцкіх тэатраў Нясвіжа, Слоніма, Слуцка, Гродна, Шклова. Асаблівай пышнасцю вылучаліся спектаклі шклоўскага тэатра С. Зорыча, слонімскага тэатра М.К. Агінскага, нясвіжскага тэатра Радзівілаў (мастакі К. Гескі, К. Атасельскі). Вялізныя памеры сцэн прыватнаўласніцкіх тэатраў давалі магчымасць для выканання самых складаных праектаў дэкаратара, які адначасова з'яўляўся і жывапісцам, і архітэктарам, і машыністам сцэны. Афармленнем спектакляў займаліся як замежныя майстры, так і мясцовыя дэкаратары. Асноўным спосабам вырашэння сцэнічнай прасторы была кулісна-арачная сістэма дэкарацый. Часта дэкаратары дасягалі незвычайнай грандыёзнасці фантастычных архітэктурных збудаванняў, што ператварала спектакль у яркае і эфектнае відовішча ў стылі барока.

У пачатку XIX стагоддзя ў беларускіх тэатрах сцэнаграфія адыходзіць на другі план, фактычна прыходзіць у заняпад. На працягу амаль усяго XIX стагоддзя мастакі не стваралі афармленне спецыяльна да пастаноўкі, а абмяжоўваліся адным наборам дэкарацый і касцюмаў, якія меліся ў трупе. Часта мастакі (Ю. Главацкі, І. Кураткевіч, К. Ульрых) выраблялі «тыпавыя» дэкарацыі – абстрактны фон для любых прадстаўленняў. Такім чынам, адны і тыя ж дэкарацыі выкарыстоўваюцца пры любой пастаноўцы без уліку характару твора і своеасаблівасцей манеры аўтара п'есы.

Развіццё нацыянальнага тэатра і разам з тым беларускай сцэнаграфіі звязана з тэатрам В. Дуніна-Марцінкевіча, трупай І. Буйніцкага, паказамі беларускіх вечарынак. Яны выкарыстоўвалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў афармленні спектакляў этнаграфічны прынцып (нацыянальнае адзенне, атрыбуты, інтэр'ер). І. Буйніцкі – выдатны знаўца беларускай народнай творчасці, у спектаклях галоўную ўвагу надаваў адлюстраванню побыту.

І. Буйніцкі і У. Галубок увасобілі ў сваіх тэатрах новы, прафесійны падыход да падбору касцюма. Яны выкарыстоўвалі _этнаграфічны прынцып_ у падборы касцюма, вывучалі і збіралі ўзоры народнага адзення, арнаменту, вышыўкі і тым самым дапаўнялі касцюм рэалістычнымі і сапраўднымі дэталямі, якія стваралі непаўторны «народны» каларыт. Традыцыя выкарыстання грыма для надання выгляду акцёра рэалістычнага падабенства з персанажам была ўведзена ў тэатры В. Дуніна-Марцінкевіча і працягнута ў пастаноўках У. Галубка.

У афармленні дэкарацый і касцюмаў выкарыстоўваліся народныя арнаменты, роспісы, вышыўка. Сцэна аздаблялася творамі народнага ткацтва, заднік і кулісы выраблялiся з беларускіх ручнікоў. У цэлым, афармленне было нескладаным, але граматна прадуманым. На сцэне ўстаноўліваліся самыя неабходныя дэкарацыі, напрыклад, вугал хаты, плот. Касцюмы падбіралі з паўсядзённага адзення ці шылі спецыяльна на заказ. Асноўным патрабаваннем да афармлення быў прынцып лаканічнасці і нацыянальнага каларыту.

Такім чынам, у дарэвалюцыйны перыяд на Беларусі існавалі дзве тэндэнцыі развіцця дэкарацыйнага мастацтва: панаванне тыпавых дэкарацый і рэалістычнае адлюстраванне жыцця ў творчасці мастакоў-аматараў. У 1920-х гадах на Беларусі ствараюцца дзяржаўныя тэатры (БДТ-1 (тэатр імя Я. Купалы), БДТ-2 (тэатр імя Я. Коласа)), у 1920 г. у Віцебску быў адкрыты мастацкі тэхнікум, дзе беларускія мастакі-дэкаратары праходзяць прафесійную падрыхтоўку. Мастакі А. Марыкс, К. Елісееў, Н. Ціханаў развівалі рэалістычныя тэндэнцыі ў афармленні спектакляў.

Сцэнаграфія за доўгую гісторыю свайго развіцця прайшла самыя розныя этапы: ад сімвалічнасці і ўмоўнасці афармлення першабытных рытуальных дзей да пышнасці і грандыёзнасці барока, якія ў XX ст. змяніліся ўмоўнасцю авангардызму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ